малой родины [Электронный ресурс] : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 18 июля 2018 г., № 547 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: http:pravo.by.

# САРМАТЫЗМ ЯК ДАМІНАНТА ШЛЯХЕЦКАЙ КУЛЬТУРЫ: ГІСТОРЫКА-МІФАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

***Ю. Д. Царэвіч,***
*выкладчык кафедры рэжысуры свят*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Феномен сарматызму ў гісторыка-культурнай спадчыне Беларусі займае адметнае месца, бо як з’ява ён уяўляе сабой своеасаблівы культурны феномен, які стаў адной з найбольш яскравых прыкмет грамадска-палітычнага жыцця ў ВКЛ і меў вялікі ўплыў на культурныя працэсы на землях сучаснай Беларусі.

У XV ст. польскі гісторык Ян Длугаш (1415–1480) упершыню напісаў пра з’яву сарматызму (праца «Летапісы, або Хронікі слаўнага Каралеўства Польскага»), а астролаг Мацей Карпіга з Мехава (Мацей Мехавіта, 1457–1523) рабіў спробы замацаваць, пашырыць гэта паняцце. Яго кніга «Tractatus De Duabys Sarmatus» («Трактат пра дзве Сарматыі») была апублікавана ў 1517 г. у Кракаве і перакладзена на нямецкую, дацкую, італьянскую мовы. Галоўная ідэя працы Мацея Карпігі заключаецца ў тым, што на тэрыторыі ВКЛ калісьці існавалі сарматы, якія склалі этнічную аснову для палякаў, літвінаў і русінаў, якія сёння з’яўляюцца іх нашчадкамі і культурнымі спадкаемцамі. Многія гісторыкі XV–XVII стст. (М. Бельскі, М. Стрыйкоўскі і А. Гваньіні і інш.) спрабавалі пацвердзіць, што шляхецкае саслоўе ВКЛ ёсць нашчадкам свабоднага, качавога і ваяўнічага народа – сарматаў. Яго росквіт суадносіцца з II ст. н. э., а этнічная тэрыторыя – Сар-

матыя (потым старадаўняя лацінская назва Рэчы Паспалітай) лакалізавана пераважна ў прычарнаморскіх стэпах.

Вывучэннем сарматызму займаліся не толькі гісторыкі, але і філолагі, мастацтвазнаўцы, гісторыкі культуры і прадстаўнікі сумежных дысцыплін. Кожны са спецыялістаў вызначаў сарматызм як сукупнасць рыс, якія абумовілі спецыфіку цэлай эпохі гісторыі і культуры ВКЛ [2, с. 20]. Сармацкі народ быў вядомы па творах антычных аўтараў Герадота, Мацэліна, Пталямея, Страбона, Тацыта і інш. Спасылаючыся на антычных аўтараў, па ўяўленні якіх сарматы, як і скіфы, былі варварскімі, ваяўнічымі плямёнамі, польскія гісторыкі вызначалі сацыяльна-культурны статус шляхты наступным чынам: «Менавіта мы і ёсць сарматы ... і таму тое, што пра сарматаў пісалі, правільна лічыць напісаным пра продкаў нашых» [5, с. 2].

Шляхецкае саслоўе, такім чынам, атаясамлівалася з сарматамі, паколькі з’яўлялася генетычным нашчадкам сармацкага народа [2, с. 47]. У кантэксце гэтага актуальнай была тэма пераемнасці духоўнай спадчыны сарматаў: «Мы ... усё, чым валодаем, прыпісваем грэкам, рысы якіх, як дрэнныя, так і добрыя, наследуем ... Успадкоўваем дабрачыннасць грэкаў, таму што на іх прыкладзе вызначаліся ў навуках, узнагароджаны іх мужнасцю, такія ж прыткія ў прамовах і адважныя ва ўчынках ... Наш народ славіцца памяркоўнасцю, прыгажосцю ... Мастацтва і валоданне словам мы запазычылі з Афін, а прыгажосць і парадак – са Спарты. Такіх продкаў мела нашая Бацькаўшчына», – пісаў у XVI ст. С. Ажахоўскі (1513–1566) [7, с. 7–8]. Паходжанне шляхты ад антычных народаў (грэкаў і рымлянаў) адначасова залічала яе да нашчадкаў апісанага Герадотам (V ст. да н. э.) племені сарматаў. Храністы і мысліцелі сярэдзіны XVI ст. шукалі агульныя антрапалагічныя рысы або іншыя аналагічныя знешнія прыкметы і праявы таго, што пазней будзе названа нацыянальным партрэтам або нацыянальным характарам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, сарматызм як дамінантная тэндэнцыя самасвядомасці шляхецкай эліты сфарміраваўся ў эпоху Позняга Рэнесанса на рубяжы XVI–XVII стст. у шляхецкім асяроддзі на глебе палітыка-прававога статусу дваранскага саслоўя ў грамадстве і дзяржаве. Асноватворным канцэптам сарматызму стаў міф аб адмысловым паходжанні шляхецкага народа, пад якім, падкрэслім, разумелася толькі дваранства.

Аснову такога міфалагічнага ўяўлення мысліцелі запазычылі з гістарычнай рэальнасці сацыяльнага жыцця Рэчы Паспалітай. Дваранскае саслоўе – шляхта традыцыйна выконвала ў грамадстве функцыю абароны дзяржавы. «Чалавек збройны» ў ВКЛ мог быць выхадцам толькі з шляхецкага саслоўя. Прывядзем Фрагмент тагачаснай прамовы магната: «Вы – прыродныя сарматы, выхаванцы магутнага Марса, а продкі вашыя некалі на Захадзе ў Эльбе, а на ўсходзе ў Дняпры забілі жалезныя сваі, як помнікі вечнай славы!» (Гаворка гетмана Хадкевіча перад Хацінскай бітвай, 1621 г.) [4, с. 70]. Міфалагічная інтэрпрэтацыя старажытных сарматаў як ваяўнічых плямёнаў, заваёўнікаў прывяла да таго, што нашчадкамі сарматаў заканамерна стала лічыцца выключна вайсковае шляхецкае саслоўе.

Французскі філосаф Ралан Барт сцвярджаў: «І ў старажытнасці, і ў наш час міфалогія можа знайсці сваю аснову толькі ў гісторыі, таму што міф – гэта слова, абранае гісторыяй, ён не можа ўзнікнуць з «прыроды» рэчаў» [2, с. 9].

Сутнасць тэрміна «сарматызм» змянялася ў грамадстве ВКЛ на працягу некалькіх стагоддзяў. Спачатку яго сэнс зводзіўся да вызначэння старадаўняга польскага ладу жыцця і нацыянальнага характару. У другой палове XVIII ст. пад сарматызмам, а дакладней сармацкасцю, мелася на ўвазе сукупнасць пэўнага тыпу знешнасці і стэрэатыпаў паводзін. Грамадскае разуменне паняцця «сарматызм» спалучалася перш за ўсё з перыядам «шляхецкай рэспублікі» ў гісторыі Рэчы Паспалітай, са старадаўнімі польскімі звычаямі, гіста-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рычнымі традыцыямі і вобразам тыповага шляхціца, які называў сябе сарматам [2, с. 19]. Дзякуючы сарматызму ў грамадстве ўзрастала цікавасць да гісторыі роду, сям'і, асобы. Веданне гісторыі сваіх продкаў было абавязковым, бо яно давала галоўнае абгрунтаванне высакароднасці шляхціца, уласцівае яму ад нараджэння.

Многія роды Польшчы ўзводзілі свой радавод да антычных герояў і замацоўвалі гэта ў гербах. «З апошняй чвэрці XVI ст. і амаль да канца XVIII ст. польскі шляхціц ставіўся да свайго гербу як да самай каштоўнай уласнасці, а генеалагічны міф, з ім звязаны, успрымаў без усялякіх агаворак як фактычную гісторыю роду», – піша сучасны польскі даследчык І. Левандоўскі [6, с. 228]. Заахвочванне гісторыяй і сімволікай свайго герба, якія мелі вялікае значэнне, было выклікана мэтай не толькі ведаць аб прадзедах і іх подзвігах, але і замацаваць ўсведамленне родных сувязяў паміж шматлікімі родамі, іх пэўную іерархію па знатнасці і ролі ў дзяржаўным і грамадскім жыцці.

Так, у паэтычнай форме Ваўжынец Хлябоўскі сфармуляваў асноўныя каштоўнасці шляхецтва, якія перадаваліся па спадчыне:

Когда же будете верны отцов своих поступкам,
Вы мужеством себя прославите примерным,
И достоянья государства защитив,
Отчизну милую спасете от напастей.
Лишь общие усилья вам подмога,
И каждодневный, постоянный труд,
Ума, Любви, Согласия единство –
Не в час один взойдут благие всходы,
Но сообща увидите плоды.
Так снова золото свободы засверкает,
И слава разнесется по земле [10, с. 2].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, пошукам уласных гістарычных каранёў і праекцыяй сябе ў далёкае мінулае прадстаўнікі шляхецкага саслоўя Польшчы і часткова Беларусі, Літвы і Украіны даказвалі, што яны з'яўляюцца нашчадкамі вольнага, качавога і вольналюбівага народа – сарматаў. Менавіта такая пазіцыя стала асноватворнай у самавызначэнні шляхты. Абапіраючыся на гістарычныя факты і даследаванні навукоўцаў, можна зрабіць выснову, што сармацкая саслоўная ідэалогія складваецца ў рамках міфалагічнай свядомасці і паступова эвалюцыяніруе ў напрамку стварэння нацыянальнай ідэалогіі і ідэалагізаванай гісторыі.


1. *Клімуць, Л. Я.* Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI–XVIII стагоддзях / Л. Я. Клімуць. – Мінск : Беларусь, 2013. – 127 с.: іл. – (Сер. «Беларуская гісторыя»).

2. *Лескинен, М. В.* Мифы и образы сарматизма. Истоки национальной идеологии Речи Посполитой / М. В. Лескинен. – М. : Ин-т славяноведения РАН, 2002. – С. 178.

3. *Мелетинский, Е. М.* Общее понятие мифа и мифологии / Е. М. Мелетинский // Мифологический словарь. – М., 1990.

4. *Собеский, Я.* Мемуары / Я. Собеский // Мемуары, относящиеся к истории Южной Руси. – Вып. 1–2. – Киев, 1890–1896. – Вып. 2.

5. *Bielski, M.* Kronika Polska / M. Bielski. – Krakow, 1564.

6. *Lewandowski, I.* Rzymska i rzymska-sarmacka genealogia rodów szlacheckich w niektórych Herbarzach staropolskich / I. Lewandowski // Swiadomosc historyczna Polakow. Problemy i metody badawcze. – Łódz, 1981.

7. *Orzechowski, S.* Kroniki Stanisława Orzechowskiego przez M. Zygmunta Alexandra nalecz Włynskiego w Akademii Krakowskiej z łacińskiego na Polskie przetlumaczone / S. Orzechowski. – Warszawa, 1767.

8. *Orzechowski, S.* Policya Królestwa Polskiego na kształt Aristotelesowych Polityk wypisana i na swiat dla dobra pospolitego trzema knihami wydana / S. Orzechowski. – Przemyśl, 1784.

9. *Tazbir, J.* Synkretyzm a kultura sarmacka / J. Tazbir // Teksty. – 1974. – № 4.

*10.* Wizerunek wiecznej sławy Sauromatow starych pobudzaiący młodź rycerską ku naśladowaniu spraw ich od szlachetney Pallady, z gniazda cnot


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ich, w Ojczystym Parnasie ubudowany, a przez Wawrzynca Chlebowskiego z przykłady mężów Rzymskich, onych wielkich miłośników Ojczyzny opisany i wydany. – Krakow, 1614.

# ПРЕДВАРИТЕЛЬНЫЙ АНАЛИЗ ФОРТЕПИАННОГО ЭТЮДА ЭПОХИ КЛАССИЦИЗМА

***Чаоломэн,***
*аспирант кафедры белорусской и мировой художественной культуры Белорусского государственного университета культуры и искусств*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В середине XVIII в. западная музыка перешагнула из эпохи барокко в эпоху классицизма, композиторы стали уделять внимание новым техникам и приемам. В истории фортепиано произошли эстетические перемены, также случилась модификация клавишных инструментов. Логика композиторской мысли, мастерство исполнения – все это достигло небывалого развития.

Музыкальный стиль и творческие приемы классической музыкальной школы претерпели огромные изменения по сравнению с периодом барокко, на смену претенциозности, блеску, музыкальной бессодержательности позднего барокко пришли естественность, простота и радость. Касательно ладовой системы «полностью сформировалась мажорно-минорная система; лейтмотив занимает важное место, так мелодия становится самым важным элементом музыкальной текстуры, бас и аккорды используются только как аккомпанемент, образцом чего может послужить манера Д. Альберти; структура мелодии, в отличие от плавного движения стиля барокко, подчинена определенному порядку; ритм также сформировался в периодическую структуру; развитие главной музыкальной темы (лейтмотива), упорядоченные динамичное крещендо, филигранное диминуэндо и т. д. – все эти элементы часто встречаются в произведениях периода клас-